■ Простая мова

«ПАЧЫНАЕЦЦА ЎСЁ З ЛЮБОВІ...»

«Як ля парога, такая і дарога».

Ну паспрабуй не ўзгадаць гэту прыказку, калі з самага ранку і ля самага дома кот наперарэз — вялізазны, чорны. Хоць ты назад вярніся...

Але трэба ісці...

Дык чаму б тады на хаду не падумаць, што кот, вось такі, у некага дома жыве, «дарогу» пераходзіць не раз на дні... І нічога: ніякіх непрыемнасцяў — толькі радасць.

ДЗЕ Я?

Горад, дзень — народу ў аўтобусе мала. Да таго ж кіроўца, відаць, профі: плаўна пад'язджае да кожнага прыпынку, плаўна кранаецца з месца, ды і потым яго машына як быццам не едзе, а проста плыве па вуліцах. Не дзіва, што адзін з пасажыраў (відаць, напрацаваўшыся?..) спіць: спіць, выпрастаўшы ногі, прыхінуўшыся да акна, а ўжо ж соладка...

І, здавалася, моцна. Аднак не — на старым «ляжачым паліцэйскім» наш аўтобус крыху падкідае, пасажыр прачынаецца — спешна «падцягвае» ногі, няўцямна пазірае вакол, пытае ў чалавека, што сядзіць насупраць:

— Дзе я?

— Батанічны сад праязджаем, — ахвотна адказвае той.

— А горад які?

...Значыць, і сапраўды, «напрацаваўся» чалавек, прычым няслаба.

НЕЛЮБОЎ? ДА ХАЛАДОЎ

Крамы таварам забітыя — носа не ўткнуць, штось з адзежы проста не выцягнуць з кранштэйнаў, не разгледзець... Ну але ж...

За спадніцу вочы «зачапіліся» — доўгая, чорная, элегантная. У такой куды хочаш можна пайсці: зранку — на працу, вечарам — у госці альбо ў тэатр...

— Яна з жакетам, гэта касцюм, — абрывае думкі прадавачка. — І, дарэчы, акурат на вас.

Прыйшлося памераць.

Спадніца «села», як тут і была, а вось верх...

— Велікаваты як быццам?

— Ну што вы! Ды ў самы раз! — пераконвала дзяўчына і гэтак жа настойліва раіла: — Бярыце, не пашкадуеце.

Узяла (не без ваганняў, праўда), прынесла дамоў і спадніцу нават насіла.

А вось жакет... «Вазьмі, Даніла, што нам няміла» — хто яго толькі ні мераў! Марна: некаму з сябровак-суседак-сваячак не падыходзіў колер, некаму фасон, памер... У выніку новая добрая рэч з крамнаю біркаю ў шафе так бы і вісела... Каб не мароз.

А прыціснуў — і неяк нечакана высветлілася, што той жакет зусім не вялікі («мой памерчык», як казаў Папандопала). А ўжо ж цёплы, утульны, мілы...

Яшчэ і тым, што ніхто яго не ўзяў...

Гэта мы пра што? Пра адзежыну, рэч... Хоць з тым жа поспехам маглі і пра... чалавека.

СКАЗАЎШЫ «А»...

Памылкі, не вам казаць, бываюць. Бываюць граматычныя, сінтаксічныя, стылістычныя, гістарычныя, геаграфічныя... Бываюць, урэшце, грубыя і бываюць смешныя. У артыкуле пра тое, як засцерагацца ад холаду, як ратавацца, калі ўсё-ткі змерз, каляжанка раіць самае простае — рукі сагрэць «пад... мышкамі».

І пры гэтым не піша, на жаль, дзе ж іх браць? Як дамовіцца з катом, каб налавіў?.. Ці трэба самому?

«РЭПЕТЫЦЫЯ»

...Яна ў сорак (з хвосцікам) выглядала, можа, на трыццаць, ён — наадварот.

Але гэта яны заўважылі потым. А тады...

Сонейка, мора, пляж — доўгачаканы водпуск. І падчас яго так дарэчы маленькі курортны раман...

Вось толькі з «памерамі» яны «прамахнуліся»: думалі, што раз'едуцца па дамах, па сваіх гарадах, і ўсё скончыцца, а выйшла інакш: ледзь не кожны дзень званілі адно аднаму; ён за моду ўзяў прыязджаць — на выхадныя, на святы... Альбо яе да сябе выцягваць... І ў адпачынак ездзілі: ну чаму б і не, калі разам добра і калі абое яны — людзі вольныя (у разводзе). А так — «як бы» шлюб у іх, гасцявы...

Ды і сапраўдны мог атрымацца! Ён прапаноўваў. Гэта яна адмаўлялася, гэта яна баялася і «хавалася» то за дзяцей, яшчэ неўладкаваных, то за матулю, як быццам старую і вельмі хворую... Галоўнай жа прычынай быў злашчасны ўзрост: яму на адзінаццаць гадоў менш. Значыць, не сёння-заўтра ў яго, пры ўсім, далёка не беднага (толькі вокам міргні!) магла з'явіцца іншая, куды маладзейшая, прыгажэйшая, разумнейшая... Ёй не хацелася быць пакінутай (да таго ж — яшчэ раз)...

А ён, падобна, не збіраўся яе кідаць: не так даўно вось чарговую прапанову зрабіў, больш за тое — змусіў яе не проста падумаць, а пераехаць да яго і жыць.

Яна згадзілася — на «рэпетыцыю». Амаль месяц пражыла. Болей, прызналася, проста не змагла.

Не змагла многага. Ну, па-першае («хоць салому ем ды фасону ж не губляю»!), днямі хадзіць на абцасах і без акуляраў; мераць ціск крадком, піць таблеткі гэтак жа, прачынацца нашмат раней, каб не ўбачыў без прычоскі ды макіяжу, спаць у непрывычнай піжаме...

— А дома — ну як ажыла, — расказвала сяброўкам са смехам. — Прыехала, у ванну залезла, выкупалася, потым халат на плечы, ручнік на галаву — і на канапу... Ну які ўжо замуж? Дзе мне лепей будзе?

...Бацькі, значыць, праўду казалі: «Еш з голаду, любі — змоладу»?

Ды не ўсім на гэта пашчасціць.

ЖЫЦЦЁ, ЯК АНЕКДОТ

Штодзённшчына: раніца, рэдакцыя, тэлефонны званок. Голас у слухаўцы мужчынскі, зусім незнаёмы, але малады і досыць прыемны — прамаўляе (па-беларуску), што адправіў артыкул, што хацеў бы ведаць, ці атрымалі, ці будзем друкаваць...

У тым выпадку адказаць зусім няцяжка было: праз гадзіну-другую набрала патрэбны нумар, для парадку ўдакладніла:

— Спадар Мацвей?

Рэакцыя досыць нечаканая:

— Хто-о-о?! — пакрыўджана (ды што там — абурана!) перапытаў той...

І тым самым нагадаў кароткі, як стрэл, анекдот з жыцця пасажыраў:

— Спадарыня, ну што вы сталі, як карова!

— Якая я вам спадарыня?!

МАЛЫ ДЫ ЎДАЛЫ

Шыкоўная кніжка (наклад, дарэчы, 300 асобнікаў) — «Слоўнік беларускіх народных параўнанняў»! Чаго ў ім толькі няма, чаго не сабрана працай рупліўцаў! Ну вось пра сабаку, напрыклад. Уяўляйце, запамінайце (раптам спатрэбіцца?), успамінайце: з*'ехаць, як сабака з сена; пажывіцца, як сабака мухаю; разгуляцца, як ён жа ў торбе; гонару, як у сабакі блох,* хоць часцей за ўсё *трэба ён, як сабаку гальштук, паабяцаць, што сабаку хвастом махнуць...* (Ёсць, ёсць вось такія людзі!.. А колькі гэтакіх (з кніжкі ж таксама слова не выкінеш? — **Аўт.**): *адзін брэша, як сабака, а другі маўчыць, як ср...ка...*

Магчыма таму, што *«дурны, як сабака да года»?..*

Пад уражаннем і разумны сабака ўзгадаўся.

З ім, маленькім, — расказвалі — адна пані, вярнуўшыся з Вільні, у парк пайшла. А там скуль ні вазьміся дзіця — насустрач выбегла. Сабачка неспадзеўкі — яму пад ногі. Малое ад страху ў крык... Добра — пані не разгубілася, і не ліхадзейкай была: падхапіла малое на рукі, загадала папляваць, завяла ў свой пакой, пачаставала і дала 5 злотых: па тым часе вялікія грошы — за іх 2 мяшкі жыта можна было купіць.

Мусіць, таму кемлівая малеча, дачушка парабкаў, шмат разоў яшчэ бегала ў парк: хочучы зарабіць, выскаквала насустрач пані з сабачкам. Аднак той дзіця больш не чапаў. Відаць, «не да года» быў. Хоць і маленькі.

НЕ ПРА ДАХ

Гэтыя аднакласнікі, як многія, відаць, абяцалі сустракацца ў школе штогод, а вось прыязджалі...

Ці вам казаць — праз год пасля выпуску, потым — праз пяць, праз 20 і сёлета — праз сорак. Аж пятнаццаць чалавек з двух класаў сабралася — пераважна «дзяўчат». Праўда, «хлопцы» таксама былі. І нават зрабілі ўсё па-даросламу, па-мужчынску: прывезлі на сустрэчу любімых настаўнікаў, загадзя заказалі «нішу» ў рэстаране...

Добранька пасядзелі: пагаварылі, паўспаміналі, папілі-папелі, патанцавалі, а «дзяўчаткі» дык нават папляткарыць паспелі і пасакрэтнічаць.

Адна з іх расказала, прынамсі, як закахалася («дах падчыстую знесла!»), як кінула дом, дзяцей (!), як паехала на край свету... Як жыла там, што называецца, «на разрыве» паміж сапраўдным і пакінутым, як яно, тое апошняе, стала ўсё больш перацягваць і як тады першы муж ёй сказаў: «Кінь дурное і вяртайся. Слова даю, што ніколі ні ў чым не папракну»...

«Санта-Барбара», карацей.

«Дзеўкі» слухалі яе, стаіўшы дыханне, а адна — самая чуллівая — дык і наогул слязу пусціла.

— Не трэба мяне шкадаваць, — спыніла яе апавядальніца.

— А я не цябе, не! — шморгнула носам аднакласніца. — Я... сябе шкадую: ані разу ў жыцці мне «дах не зносіла»...

І ўжо не знясе.

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ

Вечар. Горад. Метро.

— Станцыя «Няміга», — аб'яўляюць па гучнай сувязі.

Аб'яўляюць немаведама каму, бо вагон амаль пусты: пяць чалавек выйшла, адзін зайшоў: высокі-высокі, худы-худы, у даўжэзным, да пят, чорным паліто з капюшонам, што закрываў паўтвара...

Для поўнай жуды толькі касы ў руках не хапала.

ДРЭННА — І ТАК, І ГЭТАК

...«Ну, ці добры ў вас дзень? — сумяшчаючы вітанне з пытаннем, цікаўлюся ў знаёмага дзеда.

Адказвае ён па-рознаму: то ўлюбёным: «Паскудства, брат, і не пытайся», то (з-за бяссонніцы — гадзін у 11...): «Не ведаю — ён жа толькі пачаўся...», то, апошнім часам: «Не хочацца ні жыць, ні паміраць»...

Што зразумець няцяжка. Асабліва калі ведаць, што ён, насамрэч стары і хворы — зусім адзін... Калі не лічыць сястры, праўда, зводнай, гадоў на 20 за яго маладзейшай і, па сутнасці, зусім чужой...

Аднак менавіта яна — спадкаемца: на кватэру, на якія-ніякія грошы...

І каб адна — дзед бы не гараваў: «Халера з ім, з дабром за жыццё набытым»... А то ж трое сыноў у кабеты — боўдзілаватых, дарослых, а ўжо ж сквапных... Спяць і бачаць яны, як стары памрэ, як яны тады...

Пазабіваюцца ж, перагрызуцца...

У ЧЫМ ВЫМЯРАЕЦЦА ШЧАСЦЕ

Горад, кавярня, шматлюдны абед і над усім — гучнае пытанне:

— Э-э, хто на ўваходзе свой чорны «Мерседэс» паставіў?!

Замест адказу і з-за таго ж століка:

— Слухай, чаго ты равеш? Гэта ж твая машына!

— А можа, хто не ў курсе?!

Гэта анекдот пра Наташу, бо яна, здаецца, і сапраўды ўсяму свету ўжо рассказала, што дзве машыны дабіла, а цяпер ёй бацька трэцюю купіў — новенькую, з салона...

— Добра табе...

— Шчаслівая...

— Багатая, — за вочы і ў вочы зайздросцяць ёй сяброўкі, бо...

Бо яно і сапраўды ў іх, 20-гадовых, шчасце ды багацце можа вымярацца «ў машынах». А вось потым, напрыканцы...

Хіба ў колькасці людзей (пажадана побач!), якіх любіш ты і якія любяць цябе.

Яны — ці не адзінае дабро, што нажываем мы не за грошы, не мазалём ці хітрасцю — працаю душы.

Валянціна ДОЎНАР.

<u>Ад яе ж</u> і, магчыма, новым падпісчыкам: кніга, складзеная з такіх вось абразкоў-карацелек «Каб сказаць і... пачулі», у кнігарнях Мінска, прынамсі, яшчэ прадаецца. Пытайцеся.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Тыдзень вельмі спрыяльны для самазабыўнай працы. Вы павінны мабілізаваць усе свае сілы для рашучага прарыву, але паспрабуйце пры гэтым не забываць і пра адпачынак. Калі магчыма, арганізуйце для сябе вольны рэжым працы, гэта павінна станоўча паўплываць на вашы творчыя здольнасці. У выхадныя ўстройце невялікае, але незабыўнае свята для сваіх сяброў, яны абавязкова будуць у захапленні.

ЦЯЛЕЦ. Настае спрыяльны момант для актыўнай дзейнасці. Збярыцеся з сіламі і не дазваляйце сабе расслабляцца і ўпадаць у засмучэнне. Перш чым прыняць канчатковае рашэнне, прадумайце ўсе дробязі, тады ўсё абавязкова атрымаецца. У найбольш рашучых прадстаўнікоў знака можа з'явіцца магчымасць пачаць уласную справу.

БЛІЗНЯТЫ. Тыдзень давядзецца прысвяціць працы і дзелавым кантактам, і з самага яго пачатку вы адчуеце сябе паглыбленым у гушчу падзей. Калі ў прафесійнай дзейнасці вы зможаце захаваць разумны кансерватызм і старыя праверраныя звычкі, вам будзе спадарожнічаць поспех. Да канца тыдня можаце заўважыць відавочны рост вашага матэрыяльнага дабрабыту. Але пазбягайце мітусні і дробязнасці, імкніцеся адсочваць усе падзеі, якія адбываюцца, інакш дапушчаныя памылкі могуць негатыўна адбіцца на ўзаемаадносінах з начальствам.

РАК. Падрыхтуйцеся да досыць напружанага тыдня, будзе неабходна сканцэнтравацца на самым галоўным і не разменьвацца па дробязях. Залогам поспеху можа стаць спалучэнне здаровага славалюбства з практычнай хваткай. Магчымыя паездкі і камандзіроўкі дазволяць вам не толькі папрацаваць, але і добра адпачыць. У пятніцу паспрабуйце зменшыць нагрузку на працы да мінімуму. У выхадныя не дазваляйце блізкім людзям лезці да вас з зануднымі маралямі.

ЛЕЎ. На працягу ўсяго тыдня ў вас павінен быць роўны і добры настрой, але толькі ў тым выпадку, калі вы дасце сабе магчымасць адпачыць. Спакойная плынь працоўных спраў будзе выклікаць аптымізм. Вельмі ўдалы час для заняткаў творчасцю ці для актыўнага адпачынку за межамі горада. Хтосьці, каму ў мінулым вы аказвалі дапамогу, прыемна здзівіць вас у пятніцу. Не забывайце, што толькі такт і дыпламатыя дазваляюць паспяхова спраўляцца з далікатнымі праблемамі, якія ўзнікаюць.

ДЗЕВА. Спрыяльны час для вывучэння новых кірункаў у вашай прафесійнай дзейнасці. Тым не менш усё новае павінна будавацца паступова, пазбягайце радыкальных рашэнняў. Назапашаныя справы могуць перашкаджаць рухацца наперад. Складаная сітуацыя на працы запатрабуе неадкладнага вырашэння. У выніку адчуеце, што да вашых прафесійных абавязкаў неабходны зусім новы падыход. Могуць адбыцца значныя падзеі, звязаныя з вашым жыццём, таму не забывайце пра адказнасць за здзейсненыя ўчынкі.

ШАЛІ*. Нягледзячы на тое, што настае даволі спрыяльны перыяд, не забывайцеся, што канкурэнты ўсё ж не дрэмлюць. Не варта дэманстраваць усім і кожнаму слабыя месцы. Акуратней з рашучасцю, яе зусім не абавязкова даводзіць да неразважлівасці. Паспрабуйце накіраваць сілы на здабыццё душэўнай раўнавагі і працягвайце давяраць інтуіцыі.

СКАРПІЁН*. У любой справе галоўнае — своечасова спыніцца, у адваротным выпадку спаборніцтва з нечаканымі канкурэнтамі рызыкуе паглынуць усе вашы думкі, аддаляючы шанцы на поспех справы. У аўторак не рэкамендуецца займацца тым, што патрабуе ад вас занадта вялікай адказнасці. У суботу магчыма запрашэнне на афіцыйную імпрэзу ў прыемнай элітарнай кампаніі, так што не шкадуйце сіл на адпаведную гэтай падзеі падрыхтоўку — вам неабходна выглядаць там годна.

СТРАЛЕЦ*. Чакаецца досыць моцны вецер перамен, які гатовы занесці вас у практычна любыя далячыні, цалкам змяніўшы і месца, і лад жыцця. Найбольш бяспечным выйсцем з гэтай сітуацыі стане рашэнне адправіцца ў адпачынак ці павандраваць, але абавязкова ў такіх месцах, дзе вы яшчэ не былі. Паспрабуйце не паддавацца на правакацыі і пазбягайце магчымых пастак, старанна правяраючы ўсе факты і праяўляючы асцярожнасць.

КАЗЯРОГ*. Настае настолькі спрыяльны перыяд, што ён можа выклікаць пачуццё няёмкасці ад дабрабыту, які стварыўся. У дзелавым жыцці магчымыя некаторыя важныя падзеі, але не выключана, што давядзецца тлумачыць і адстойваць свае погляды ў дачыненні да працы.

ВАДАЛЕЙ*. Калі вы максімальна выкарыстоўваеце ўсе магчымасці для творчай самарэалізацыі, то тыдзень акажацца вельмі нядрэнным. Пастаўцеся да выканання працоўных абавязкаў больш старанна, папрацаваць будзе над чым. Пятніцу пажадана прысвяціць справам нескладаным, выкананне якіх не зойме шмат часу. Суботу лепш правесці ў плённых стасунках з сябрамі.

РЫБЫ*. Магчыма, давядзецца ўраўнаважыць некаторыя рысы свайго характару, каб не паўтарыць памылак нядаўняга мінулага і дамагчыся пастаўленых мэтаў. Можа адбыцца поўная змена вашых жыццёвых установак. У сераду партнёры могуць прад'явіць неабгрунтаваныя прэтэнзіі. Адпачынак у выхадныя магчымы толькі ў хатніх умовах, таму, калі на гэтыя дні вам спрабуюць прызначыць сустрэчы, адкладзіце іх: не варта мяняць яго на вырашэнне чужых праблем.

Даты | Падзеі | Людзі

1814 год — нарадзіўся (Польшча) Кольберг Оскар, польскі этнограф, фалькларыст, кампазітар. Збіраў фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы ў Польшчы, Літве, Беларусі. У кнізе «Беларусь — Палессе» змешчаны 723 песні, 105 нотных запісаў, зробленых у ваколіцах Віцебска, Кобрына, Магілёва, Мазыра, Мінска; 14 казак і паданняў, народная лексіка, апісанні адзення і жылля, звычаяў. Шмат матэрыялаў аб гістарычным і культурным мінулым многіх месцаў Беларусі, у тым ліку Жыровіц, Міра, Навагрудка і інш. Аўтар прац «Казкі з Палесся», «Вясельныя звычаі і абрады з Палесся», «Этнаграфічныя замалёўкі». Памёр у 1890 годзе.

1889 год — нарадзіўся (г. Бежацк Цвярской губерні, Расія) у сям'і святара беспрыходскай турэмнай царквы вядомы беларускі мовазнавец і педагог Мікалай Якаўлевіч Байкоў. Па заканчэнні Маскоўскай духоўнай семінарыі (1913) працаваў у розных навучальных установах Мінска як выкладчык філасофскіх і педагагічных дысцыплін, у 1922—1930 гг. — вучоны сакратар слоўнікавай камісіі Інбелкульта і Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. У сярэдзіне 1930 г. звольнены з пасады «як скампраметаваны ў друку і як чужы па сваім сацыяльным паходжанні». Зарабляў на жыццё выпадковымі заданнямі. Загінуў пасля 1945 г. Аўтар больш за 100 прац па педагогіцы, літаратуразнаўстве і мовазнаўстве. З суаўтарамі выдаў «Практычны расійска-беларускі слоўнік» (1924, з М. Гарэцкім), «Беларуска-расійскі слоўнік» (1925), «Расійска-беларускі слоўнік» (1928, абодва з С. Некрашэвічам), «Практычны беларускі вайсковы слоўнік» (1927, з А. Бараноўскім).

1917 год — Мікалай II адбыў у Стаўку ваеннага камандавання ў Магілёў. Ён пакінуў Пецярбург, так і не прыняўшы рашэнне аб новым урадзе, да якога народ і Дума мелі б давер. А зрабіць гэта яму настойліва раілі не толькі свае, але і замежныя дыпламаты... Назад у сталіцу царом апошні расійскі імператар ужо не вернецца. Праз тыдзень па шляху ў Пецярбург, на вакзале ў Пскове, ён будзе вымушаны падпісаць адрачэнне ад прастола.

Было сказана

Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:

«Кажуць: зло нараджае зло. А найчасцей — яго нараджае надзея на адпушчэнне грахоў».

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Многоквартирные жилые дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой на 100 машино-мест в границах ул. Червякова, Каховской, Сморговского тракта» 1-я очередь строительства – жилой дом №1 по генплану.

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «Фармоэкспотех», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 22 ноября 2007 г. № 2720 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101472333.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, пом. 5, каб. 3

Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ООО «Фармоэкспотех» строительство не осуществляло.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – реализация права проектирования и строительства многоквартирных жилых домов со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой на 100 машино-мест в границах ул. Червякова, Каховской, Сморговского тракта.

Строительство осуществляется с выделением очередей:

1-я очередь строительства – жилой дом № 1 по генплану;

2-я очередь строительства – жилой дом № 2 по генплану с подземной гараж-стоянкой со стороны ул. Каховская;

3-я очередь строительства – жилой дом № 3 по генплану.

Начало строительства 1 очереди – 30.12.2013 года, окончание строительства 1 очереди – 01.05.2015 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 370-60/13 от 24.07.2013 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 2083 от 22.08.2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства», №2208 (2) от 05.09.2013 г. «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменений в решения Мингорисполкома»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/973-2287 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000007006606, расположенный по адресу: г. Минск, в границах ул. Червякова, Каховская, Сморговский тракт, площадью 0,1246 га для строительства и обслуживания объекта жилого дома № 1 по генплану;

- свидетельство (удостоверение) № 500/973-2288 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000007006607, расположенный по адресу г. Минск, в границах ул. Червякова, Каховская, Сморговский тракт, площадью 0,2725 га на период строительства объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой на 100 машино-мест в границах ул. Червякова, Каховской, Сморговского тракта» 1-я очередь строительства – жилой дом №1 по генплану»;

- разрешение на организацию стройплощадки №2-209Ж-046/13 от 11.11.2013г., разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-209Ж-046/13 от 20.02.2014г. выдано инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор генерального подряда №-24-10-2013/СМ1 от 24.10.2013 г.

Первая очередь строительства – одноподъездный 144-квартирный 20-этажный жилой дом запроектирован в границах ул. Червякова, Каховская, Сморговский тракт. В подвале и на первом этаже размещаются встроенные помещения общественного назначения. В здании имеются помещения технического подполья и теплый технический чердак. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка фасадов – штукатурка с последующей покраской фасадной краской. Оконные блоки – стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. Планировки квартир выполнены с учетом принципов функционального зонирования, внутренняя отделка квартир – подготовка под финишную отделку. Здание оборудовано мусоропроводом, двумя лифтами и иными инженерными системами, необходимыми для функционирования жилого дома. Предусмотрено выполнение мероприятий по организации безбарьерной среды для физически ослабленных лиц и маломобильных групп населения. Участок благоустраивается: расставлены малые формы архитектуры, предусмотрено озеленение, устройство тротуаров, проездов, парковок.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность, входят:

помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным помещениям), лифты и лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные балконы, тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц однокомнатные, двухкомнатные, трехкомнатные, четырехкомнатные и пятикомнатные квартиры:

1-комнатные квартиры – при 100% оплате стоимости квартиры в течение 3 календарных дней с даты регистрации договора долевого строительства стоимость **1 м² 1400 долларов США.** При оплате в рассрочку стоимость **1 м² 1450 долларов США.**

2-3-4-5-комнатные квартиры – при 100% оплате стоимости квартиры в течение 3 календарных дней с даты регистрации договора долевого строительства стоимость **1 м² 1250 долларов США.** При оплате в рассрочку стоимость **1 м² 1300 долларов США.**

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ООО «Фармоэкспотех» по адресу: г. Минск, переулок Червякова, д. 21А, каб. 12. Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства ОДО «Айрон», действует на основании договора об оказании инженерных услуг от 20.07.2010 №-113/У.

Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64. Официальный сайт www.airon.by.

В суд Костюковичского района Могилевской области поступило заявление РАДЧЕНКО Нины Николаевны о признании умершим Засемкова Алексея Михайловича, 16 июня 1977 года рождения, уроженца Олекминска Якутской АССР Российской Федерации, последнее известное место жительства и пребывания: Республика Беларусь, Могилевская область, город Костюковичи, улица Бонч-Бруевича, дом № 11, квартира № 29, настоящее место пребывания неизвестно.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине Засемкове Алексее Михайловиче, сообщить их суду Костюковичского района в течение двух месяцев со дня публикации.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

ОАО «Витебский приборостроительный завод»

27 марта 2014 года в 14.00
в актовом зале предприятия по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4,
СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.

Повестка дня:

1. Отчет директора предприятия об итогах финансово-хозяйственной деятельности за 2013 год. Утверждение показателей социально-экономического развития общества на 2014 год.
2. Отчет наблюдательного совета общества о проделанной работе в 2013 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности предприятия за 2013 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2013 год.
5. Утверждение направлений распределения прибыли на 2014 год.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания можно с 17 по 27 марта в рабочие дни с 8.00 до 16.00 по месту нахождения общества (приемная).

Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 300048171

Наблюдательный совет.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению коммунального сельскохозяйственного унитарного предприятия птицефабрика «Новая заря» (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже

АВТОМОБИЛЬНОЙ ТЕХНИКИ:

<u>Лот № 1:</u> автокран Зил 431412, КРАН КС 2561 (1990 г.в., г/н ОМ 6754). Начальная цена – 25 000 000 бел. руб.
<u>Лот № 2:</u> автомобиль УАЗ 3303 (1992 г.в., г/н ОА 3278). Начальная цена– 11 000 000 бел. руб.
<u>Лот № 3:</u> автомобиль ГАЗ 3110 (2007 г.в., пробег 351 615 км, г/н 2726 ВН-5). Начальная цена– 29 000 000 бел. руб.
<u>Лот № 4:</u> автомобиль ГАЗ 3110 (2000 г.в., пробег 148 993 км, г/н 4553 ЕА-5). Начальная цена– 14 000 000 бел. руб.
<u>Лот № 5:</u> авторазливочная станция АРС-14, шасси № 231031(без регистрационных документов). Начальная цена– 24 000 000 бел. руб.

Транспорт находится по адресу: Минская область, Мядельский район, д. Выголовичи, ул. Зеленая, 40.

Задатки в размере 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. В течение 15 рабочих дней после оплаты за объект продавец снимает с учета транспортных средств и передает покупателю автомобильную технику. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.12.2013.

Аукцион состоится **06.03.2014 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.03.2014 до 16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя № 190204517 на имя Устинович Андрея Васильевича **считать недействительным в связи с утерей.**

УНП 790386638

ОТЧЕТ
Местного фонда развития сельских территорий
«Возрождение – Агро»
об использовании своего имущества за 2013 год

Количество учредителей Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение – Агро» – 10 человек, из них 10 – физические лица.

Информация о стоимости имущества местного фонда развития сельских территорий «Возрождение – Агро» (далее – Фонд):

- стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет – 3 500 000 белорусских рублей;
- поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с Уставом Фонда (целевое финансирование), составляют – 250 265 070 белорусских рублей;
- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 5 833 600 белорусских рублей.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет – 202 530 759 белорусских рублей.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества

«Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

26 марта 2014 года в 14.00
СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
открытого акционерного общества
«Дорожно-строительный трест №1, г. Витебск»

Собрание пройдет по адресу: **г. Витебск, ул. Суворова,16, актовый зал**

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год и основных направлениях деятельности Общества на 2014 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2013 г.
3. Утверждение заключения аудиторской проверки финансовой деятельности Общества за 2013 год, заключение ревизионной комиссии по результатам проверки Общества за 2013 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О выплате дивидендов в 2014 году.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение новой редакции Устава Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), с 19 по 25 марта 2014 г. (время работы с 8.30 до 17.30), тел. 37 45 66. Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.**

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию на 25 февраля 2014 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 300000398

Наблюдательный совет